Аркадзь Куляшоў

ГРАНІЦА

Аповесць у вершах

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя мастацкай літаратуры
Мінск 1954

Папераджаю цярплівых маіх чытачоў:
Гэта аповесць далёкіх трыццатых гадоў.

Гэта аповесць аб тым,
як, зімою і летам,
Мы вартавалі, на нашых
былых рубяжах,
Мірны свой дом,
што Крамлём узвышаўся над светам;
Як мы, —
яго жыхары з комсамольскім білетам, —
З клопатаў першых аб ім
пачыналі свой шлях;
Як мы выходзілі дружна
насустрач пагрозе,
Што патаемнымі сцежкамі
кралася ў дом,
Як мы адказвалі,
стрэўшы бяду на дарозе,
На нечаканы агонь яе
стрэчным агнём.

Гэта аповесць мая
пра сардэчных сяброў...
Не для забавы ім
песню складаю я гэту,
А каб праз іх перадаць яе,
як эстафету,
Пяцідзесятым гадам
ад трыццатых гадоў.
Не калыханкай бацькоў
над спакоем дзяцей
Хай гэта песня гучыць, —
а як памяць жывая
Аб той граніцы трывожнай,
што свет раздзяляе,
З гулам праходзіць па сэрцах
мільёнаў людзей.

1

Той каляндар адрыўны, што на сценцы ў бацькоў, —
Кніга, бясспрэчна, карысная для хлапчукоў.

Могуць па ім, без прыладаў падзорных, як след
Знаць яны месцазнаходжанне зор і планет.

Могуць яны аб працягласці дня і начы
Летам дазнацца з яго, у паход ідучы.

Дасць на пытанне любое ён поўны адказ.
    Год? Трыццаць першы. Час году? Канікулаў час.

Толькі для сталых студэнтаў, такіх, як Максім
Той каляндар, што ў бацькоў, недарэчы зусім.

    Ведае ўсё пра планеты ён з кніжак другіх, —
Як іх завуць і ці ёсць атмасфера на іх.

Сам падлічыў ён, блукаючы лесам адзін,
Колькі ад ранку да вечара нудных гадзін.

Што яму новага можа сказаць каляндар?
Хіба ён знае, марудных гадзін уладар,

Што са студэнткай Марынай, як ехаў сюды,
Бачыўся ў поездзе ўчора хлапец малады;

Што ён дамовіўся з ёю сустрэцца ў бацькоў
Роўна праз тыдзень, каб разам пайсці да сябро

З дня таго згоды няма ў яго з календаром.
Ён, калі-б мог, не зрываў-бы лісток за лістком,

А за ўвесь тыдзень садраў-бы іх махам адным.
Але нічога! Свайго прычакае Максім:

Некалі ён занясе, як збярэ па лістку,
Іх свайму другу — соўгаснаму вартаўніку.

З дымам махорачным пусціць у неба іх дзед,
З весткамі ўсімі, што тычацца зор і планет!

Скончыцца ўлада бяздушнага календара.
Вось і апошні лісток адарваны... Пара!

Гэтая справа ў раёне граніцы была.
Хлопец з дзяўчынаю вышлі нарэшце з сяла.

Хлеба і сала з сабою ў дарогу ўзялі.
Сонца ўставала ў той дзень, каб свяціць на палі,

Роўна ў чатыры, — як сказана ў календары...
З дзён сямігодкі Максім і Марына — сябры.

Розныя ў іх інстытуты цяпер, гарады.
З дзён сямігодкі мінула чатыры гады.

Час не малы...
І не проста цяпер ім ісці,
За гэты час стаў другім ён,
дзяўчына другою,
Хоць і праходзіць ён з ёю
дарогай былою,
Але праходзіць, нібы
першы раз у жыцці.
Чэснае слова, ніколі,
ніколі раней
Не сустракаў ён за домам бацькоўскім у полі
Гэтай юнгштурмаўкі,
гэтых чарнявых вачэй,
Гэтай чырвонай касынкі
не бачыў ніколі.
Ён і сябе самаго тут
не можа пазнаць, —
Сонца віною ці, можа,
канікулы, лета,
Хочацца песні спяваць,
нават вершы складаць.
Што гэта значыць?..
Ды лепей не думаць пра гэта,

Рэдкія лапікі поля,
    ізноў хмызнякі...
Лес ахінуў іх.
    Дарога вілася вясёла.

У Сілічах, за лясамі,
    іх родная школа,
Іх сямігодка...
    Туды і ішлі. Нацянькі.
— Сёння Міхась прыязджае...
— Не знае нічога.
— Нас не чакае.
— З табой — як турысты зусім:
Там — да Сымона ў Кавычачы,
Там — да Цімоха.
— Толькі кійкоў нехапае...

Хоць ведаў Максім,
Што да сяброў іх паклікала прыязнь жывая,
Толькі ўвесь час непакоілася,
    як ішоў,
Сэрца яго... Не забыла яно, памятае
Дружбу Марыны з Цімохам са школьных часоў.
Ён за чатыры гады не забыўся аб тым.
Думаць Максіму было і цяпер непрыемна,
Што ён за іх маладзейшы.
    Яго недарэмна
Некалі ў школе яна называла малым.

Ён не крыўдуе за гэта.
Ён права не мае.
Смешна за гэта
было-б крыўдаваць на сяброў.
Мела тады яна,
запіс метрычны сцвярджае,
Роўна шаснаццаць,
Цімох — восемнаццаць гадоў.
Меў чатырнаццаць Максім.
Дык чаго тут злавацца,
Ясная справа,
спытайце разумных людзей,
Што для таго,
каб на поспех яму спадзявацца,
Трэба было, як відаць,
нарадзіцца раней.

Ды пад ласкавым праменнем
дзявочых вачэй,
Так, як пад сонцам жаданая ягада,
спее
З новай сустрэчаю
новая ў сэрцы надзея.

Рэчка лясная... Штаніну адну закасаў,
Потым другую... Па часці рачных перапраў
Спецыяліст ён. Геолаг-жа ён!

Не паспела
Ахнуць Марына, як ён ужо нёс яе. Смела
Брод пераходзіў, яе над вадою трымаў.
Вынес на бераг... Бывай, дарагая рачулка!

Сэрцы гарачыя іх калаціліся гулка.

Сёння пазнаць у ім цяжка падлетка былога,
Стаў ён вышэйшым, дужэйшым зрабіўся намнога

Ён і яна не агледзеліся,
як дарога
Сцежкаю стала ўжо...
— Мы не заблудзім?
— Нічога,
Дойдзем па сонцу!..—
Адказваў вясёла Максім.

І заблудзілі... Калі-ж,
сярод лесу глухога,
Жытняе поле
нарэшце адкрылася ім,
Лета, якое спякотным было і сухім,
Нашых сяброў нечаканасцю новай спаткала:
З захаду раптам
на лес наляцела навала,
Кінула з хмары на дол
бліскавіцу і гром,

Пад яліну пад густую
загнала дажджом.
Жыта, якое шумела
за той яліною,
Вецер хістаў у бакі,
прыгінаў да зямлі.
З пырскамі кропляў да ног іх
адна за адною
Жытнія хвалі, як хвалі марскія, плылі.
Часта і гулка,
пад елкі густым парасонам
Біліся разам іх сэрцы...
Па гуку, па тону
Можна было зразумець,
што прычына — не гром,
Не бліскавіца, з яе нечаканым агнём.
Некалькі раз сустракаліся —
што за прыкмета? —
Позіркі іхнія ў змроку
старой яліны.
Што гэта значыць?..
Ды лепей не думаць пра гэта.

Перачакалі пад елкай грымоту яны.
Дождж адшумеў па бярэзніку, па дубняку,
Ціха зрабілася ў лесе... — Паслухай!
Пачулі
Музыку пушчаў, трывожнае ў нетрах ку-ку,

Голас нібы за кардон заляцеўшай зязюлі.
Што ім казаў яе голас? Аб долі якой?
Можа аб долі цяжкой,
што за панскай мяжой?
Можа, зблудзіўшы,
тужыў ён аб краі сваім,
Пушчы і сэрцы злучаючы рэхам адным?

Выйшлі з трывогай на сцежку
з-пад цёмнае кроны.
Хмары прайшлі.
Непатрэбен густы парасон.
Жыта ды лес... А куды ім падацца?

Законы
Мае суровыя
іх пагранічны раён.
Хоць і з дзяўчынай ідзеш
да сяброў гасцяваць,
Вока і вуха павінен
ты востра трымаць.
А заблудзіўся, тым больш
непакойся аб тым,
Як-бы не трапіць
у іншыя госці зусім.
Добра, як скончыцца
шлях твой з дзяўчынай шчасліва,

Як затрымаюць свае
      на мяжы... А як не?..
Рада была-б
      шампаламі тады дэфензіва
Выпаліць зорку
      такому гасцю на спіне.

Заначавалі ў пустым
Адзінокім гумне.

Летняя ночка каротка.
Прачнуліся рана.
Ды не прачнуліся,
Крык разбудзіў нечакана:
— Гэй, уставайце, шаноўныя!
Каля варот
Людзі стаялі. Са стрэльбамі.
Што за народ?..

— Хто вы?
— Студэнты.
— Мы збіліся ўчора з дарогі.
— Вось як! Куды-ж вы ішлі?
— У сяло Сілічы.
Пераглянуліся людзі.
— Загнулі нічога!
Гак не маленькі,
Кілометраў дзесяць лічы.

— Трэба спытаць пашпарты ў іх.
— Навошта. Не след.
Пашпарт для іх падрабіць —
Не вялікі сакрэт.
— Я разумею — хлапец,
А пры чым тут яна?

— Дзіўна пытаеш.
А ты не глядзі, што спадніца.
Можа быць гэта знарок:
Маскіроўка адна.
— Гляньце, значкі камсамольскія!
— Што тут дзівіцца...
— Правільна, годзе!
— Дзе след рязбяруцца...
— Вяжы!

Нашых сяброў на адну
Пасадзілі фурманку.
Дзядзька, што вёз іх,
Трымаў нагатове бярданку.
Дзе апынуліся?...
Можа па той бок мяжы?
Лес — ён як лес:
Асаблівых не мае прыкмет.

Полем павёз іх:
Убачылі трактара след...

Вось яна, тая граніца
са светам старым,
Вось ён, той самы
заходні кардон, за якім
Войны рыхтуюцца...
Толькі Марына, Максім
Гэту граніцу
ўяўлялі сабе не такой.
Ім уяўлялася іншаю
там, за мяжой,
Нават прырода...

А тут — як было не дзівіцца!—
Яр, якіх шмат,
а па ім — працякала
крыніца,
Ціха каменьчыкі мыла...
І гэта — граніца?
Так. Не зважай, што табе
за тым ярам відна,
Як і па гэты, па наш бок,
такая-ж сасна,
Хоць і адна ў іх пастаць,
хоць адна ў іх парода,
Доля ў іх розная.
Розная, як і ў народа...
Там — над мяжой палыноваю
чахне сасна,

Тут — заарала нядаўна
ўсе межы вясна
Новага свету —
вясна трыццаць першага года.
Колькі-ж зазнае яшчэ
завірух на пуці
Наша вясна,
колькі будзе змагацца з зімою,
Покуль здалее
са сцягам сваім перайсці
Гэты маленькі ручай,
каб шумець і цвісці
Збожжам бясконцым
за той недалёкай сасною?

Іх дакументы праверыў
Начальнік заставы,
Ён распытаў іх
Пра ўсе падарожныя справы,
Пра іх сяброў распытаў,
Пазваніў у соўгае,
Дзе быў дырэктарам
Бацька Максімаў... Наказ
Строгі, як бацька, ім даў,
Выпраўляючы ў свет,
Не захапляцца прыродаю
Там, дзе не след.

2

Зноў па моры бясконцым,
Што шумела пад сонцам,
Дзядзька вёз іх назад.

Ды не вёз, а ўсе далей
Ад мяжы іх адносіла
Жытняю хваляй.
Дзядзька вёз іх, расказваў
Пад шум каласоў:
— Гэтай ноччу мяжу
Дыверсант перайшоў...

— Многа ловяць іх тут?
— Ловяць столькі якраз,
Колькі іх праз мяжу
Засылаюць да нас.
Вы — студэнты, я чуў?
— Так... Ідзем да сяброў.
Да студэнтаў-сяброў,.
Што цяпер у бацькоў

Самі знаеце: лета.
Канікулаў час.
— Гэта праўда... А многа
Знаёмых у вас?
— А нямала,
Уся наша школа, лічы.
— А цяпер вы куды?
— У сяло Сілічы,
Там Міхась... З Ленінграда
Прыехаў, радыст.
А ў Кавычачах — друг наш —
Сымон-гарманіст,
Прыгароўскі Цімох —
Будучы інжынер.
Жыў яшчэ там Сцяпан...
Толькі дзе ен цяпер?
З млынароў ён, цураўся
Сумленных дарог...
— Ну, а вы хто?
— Геолаг.
— А яна?
— Педагог.

З дзядзькам яны
развіталіся ў полі даўно.
Крочаць у госці. Заставы
ужо не відно,

Але граніца
Нябачнай сваёй каляінай
Побач віецца ўвесь час
праз палі, праз кусты,
То прападае, то зноў,
варухнуўшы галінай,
У пешаходаў пытае
яна пашпарты.
Жыта ў палях аглядае,
у лузе — пракосы,
Дыхаюць ёй, як паветрам,
зямля і нябёсы,
Кожная хата стаіць
у маўклівым дазоры,
Кожная зорка з вышынь
азірае прасторы,
А баявою заставаю —
кожны калгас...

Сцежкай глухой
парушальнік ішоў у той час.
Хто ён? Напэўна, тутэйшы.
Ён ведаў мясціны,
Два карабіны ён нёс.
Для чаго карабіны?
Меў ён заданне якое?
Пабачыцца з кім

Трэба яму?
Асцярожна па лесе сухім
Ноччу ішоў.
Днём хаваўся ў кустах ад людзей.
Быў ён у лапці абуты.
Ісці ў іх мякчэй.
З самай граніцы
сляды пасыпаў тытунём,
Каб уцячы ад аўчарак.
Заўважылі днём,
Пэўна, яго пастушкі.
Не мінуў ён аблавы.
Шчасце яго,
што далёка было да заставы,
Што акружылі той лес
не байцы з аўчарамі,
А комсамольцы мясцовыя
з драбавікамі.
Страху хапіла;
не знаў, дзе яму ратавацца.
Лес падпаліць?
За агнём і за дымам схавацца?
З хворастам яму заўважыў
пад цёмнай ялінай,
Аж да начы праляжаў ён
у яме ваўчынай,
Дробна зубамі секунды
пад хворастам лічачы.

Цудам дасяг ён
      мясцовасці роднай — Кавычачы,
Перадыхнуў там у лесе,
      Схаваў карабіны.
А як сцямнела, уброд ён
      раку перайшоў
Каля калгаснага,
      некалі ўласнага, млына,
Дом над ракою знаёмы,
      да дому сцяжына.
Што ў гэтым доме —
      у доме ягоных бацькоў?
Бацькі і маткі няма там,
      Ён міма прайшоў.

За сялом — шыр палёў,
Лес. Лясная дарога.
Дом пры лесе — ўсяго
Поўвярсты да парога,—
Вось той самы
Прыпынак яго, да якога
Ён ішоў...

Доўга ў змроку
Чакаў ля гумна.
Вось пачуліся
Лёгкія крокі... Яна!

Ён адразу пазнаў.
Маладая жанчына
З поля сцежкаю бегла дадому.
— Паліна!..
— Хто тут?
— Ты не палохайся:
Я... Не пазнала?
— Ты? Адкуль ты?
— У госці прыехаў. З Урала.
— Што там робіш?
— Працую там.
— Іншае штосьці
Муж казаў мне.
Пра іншыя нейкія госці.
— Глупства. Кінь.
Дома муж твой?
— Забралі ў астрог.
— Ты адна?
— Мужаў брат са мной дома... Цімох.
— На канікулах?..
— Так.
— Я й забыўся зусім.
— Вы-ж у школе калісьці
Вучыліся з ім.
— Ну, а што з тваім мужам,
Са Змітраком? —
Ён-жа быў актывістам,
Бядняк-бедняком.

— Кантрабанду знайшлі ў нас,
У гэтым гумне.
Хтось падкінуў… Хто?
Часам, не знаеш ты?
— Не.
— Можа знаеш?..
— Ты што так глядзіш на мяне?

Ад ракі, з балацін напаўзлі туманы,
Дрэвы ў іх патанулі па грудзі.

Ад гумна адышліся ў зацішак яны,
Каб не чулі, не бачылі людзі.
— Кінь свой дом… На Урал мы наедзем з табой,
А якія там горы, прырода!
Зажывём там шчасліва з табою, з дачкой,
Што жыве ў маім сэрцы заўсёды.
Я-ж кахаю цябе, дарагая!
— Кінь, Сцяпан… Гэта песня старая.
— Твой Змітрок — у турме.
Жыць адной — што ў ярмо…
— Абяцаў адвакат —
Мужа вернуць з-за крат.
— А не вернуць?.. Зноў замуж не выйдзеш, дальбог.
— Не бядуй… Свісну раз на парозе,
Хлопцы з саду пасыплюцца, быццам гарох,
Толькі крокі збірай на дарозе.

Вось што... Ты нас пакінь:
І мяне, і дачку...

Ён хаваўся па ельніку,
Па дубняку,
Ён чакаў яе ноччу,
Шукаў яе днём,
Пільнаваў яе ў жыце,
Сцярог за гумном,
Ды дарэмна...

Настала ўжо трэцяе ранне.
Ён ляжаў каля прасла,
Над ім — канаплянне.
Вось пачуў, ці здалося —
гармоніка гранне...
Вышла з лесу дзяўчына, чырвонай касынкай,
Як агнём, паласнуўшы яму па вачах,
Два хлапцы ўслед ішлі за ёй той-жа сцяжынкай.
Ён глядзеў на іх, сціснуўшы фінку ў руках.
Холад сэрца скаваў, цяжка дыхалі грудзі.
З ім у школе вучыліся гэтыя людзі...

Шкадаваць сёння позна,
Што ён жыў з імі розна:
Ён у дзядзькавай хаце
Жыў, яны — ў інтэрнаце.

Ён у дзядзькі свайго сталаваўся, як дома,
А яны елі крупнік нішчымны, вядома.

Сценгазету ў нардоме парэзаў нажом,
А яны выклікалі яго на вучком.

Падаліся пасля ў інстытуты яны,
Ну а ён — за мяжу, у той край, дзе паны.

Іх карысным навукам вучылі далей,
А яго — забіваць і атручваць людзей.

Лета ў іх —для канікул, спатканняў сваіх,
А ў яго — для бадзянняў, падпалаў начных.

Не сыходзіцца толькі з гарою гара:
Вось і стрэліся тут, ля чужога двара...

На гармоніку граў аднакласнік Сымон...
Смела ходзяць яны па дуброве... А ён?

Ён баіцца ўсяго: свет чужы, край суровы.
Неслі песню Максім і Марына з дубровы.

З часу, як мы
    на дарозе пакінулі іх,
Колькі згубіў каляндар наш лісткоў адрыўных?

Хто іх лічыў!.. Не лічылі, вядома, яны,—
Дома застаўся ў бацькоў каляндар адрыўны.

Як закаханыя людзі на час не зважаюць,
Так падарожныя календароў не чытаюць.

У Міхася пабылі і пайшлі з Сілічоў
Шляхам яны, непадобным да іншых шляхоў,

Шляхам, які ад звычайных адрозніш дарог,
Што для гасцей, што для іх, спецыяльна пралёг;

Шляхам-гасцінцам, які не заблудзіць нідзе,
Сам, па бярозах сваіх, куды след прывядзе.

Ад Сілічоў да Кавычач, праз нівы, палі,
Тыя бярозы Максіма з Марынай вялі.

Так да Сымона з'явіліся нашы сябры...
Вальсы іграў ім гармонік яго да зары,

Потым павёў іх сюды, нацянькі, без дарог:
Тут іх таварыш жыве — Прыгароўскі Цімох.

— Вось і прышлі мы!.. —
Спыніўся на ўзлессі Сымон.
— Спяць яшчэ ў доме, відаць.
— Цішыня тут якая!
— Месца глухое...
На братавым хутары ён
Цэлае лета сядзіць,
На сяле не бывае.
— Што з ім такое?
— Таго не скажу вам дакладна.
Думаю так, што ў Цімоха
На сэрцы няладна. —

Брат-жа асуджаны...
— Хто яго брат?
— Беднатою
Брат кіраваў яго... Потым
Асеў на зямлі,
Як ажаніўся: займаўся
Змітрок гаспадаркай
З жонкай Палінай...

Да прасла яны падышлі,
Селі на прасла.

— Пакуль у яго не знайшлі
Гэтыя рэчы, замежнай
Кляймёныя маркай.
Кажуць, Сцяпан іх падкінуў...
— Навошта? — Прычыну
Меў ён на гэта... Ён быў
Закаханы ў Паліну.

— Дзе-ж ён, Сцяпан той?
— Сцяпан? Валацуга, ды й годзе!—
Можа падаўся туды,
Куды сонца заходзіць,
Можа на ўсход...

Гаварылі аб ім між сабою,
Як аб далёкім, чужым.

І не зналі аб тым,
Што ў гэты час ён
За праслам, а не за мяжою,
У канапляны хаваецца
Цёмным, густым,
Чуе і бачыць іх...
Хоць і парушыў нядаўна
Лінію ён межавую
граніцы дзяржаўнай,
Хоць і ляжыць тут,
ад пільных укрыты вачэй,
Не перайшоў ён мяжы,
што яго ад людзей
Рысай нябачнай,
заслонам глухім аддзяляе,
Што не па лесе кіруецца,
а па жыцці,
Не дазваляе да прасла
яму падысці,
Пераступіць праз парог яму
не дазваляе...
Гэтай граніцы
ніяк яму не перайсці.

Дом прабудзіўся.
Саскочылі з прасла. Пайшлі.
Ён-жа ледзь дыша,
Баіцца падняцца з зямлі,

3

Пасля шумлівых дарог,
з іх жыццём баявым,
Арак і хат,
упрыгожаных дзеразою,
Месца, дзе жыў іх таварыш,
сваёй цішынёю
Ім нагадала граніцу
са светам старым.
Гэткі-ж ручай. А за ім
яны ўбачылі дом,
Дом хутарскі,
фарбаваныя аканіцы.
Пасля чытальняў і клубаў
з шумлівым жыццём
Здаўся ён домам забытым —
па той бок граніцы.
Ціхі ручай перайшлі
Неспакойныя госці.
Дом, як нардом, захадзіў
Ад буйной весялосці.

Па прапанове Марыны,
У гонар спаткання,
Быў там суботнік абвешчаны
Пасля снядання.

Хлопцам — піла і сякера,
І — дровы шліце.
А для яе з гаспадыняй —
Зажынкі у жыце.

Покуль калоды пілілі
Цімох і Максім,
Покуль калоў іх Сымон
На двары хутарскім,
Жнеі абуліся ў лапці,
Абралі пастаці...

Роўныя ў росце,
Падобныя ў рухах і стаці.
Твары і плечы,
І рукі іх — колеру збожжа.

Бліснулі разам сярпы.
Хто каго пераможа?
Хто пераможа?..
Не жалі яны, а igралі,
Жыта высокае
Пальцамі перабіралі.

І не снапамі аднымі
Ўсцілалі свой шлях —
Зжатыя песні за імі
Ляжалі ў снапах.

Роўна ішлі яны.
Жаць для іх — не ў навіну.
Вось і зажалі. Зірнулі
Адна на адну,
Ветла ўсміхнуліся:
Будзем, нарэшце, знаёмы!..

Рваліся ў жыта сярпы іх,
Не чуючы стомы.

— Хопіць!.. — сказала Паліна,
Ішлі нараўне.
— Ты нездаволена?
— Гэта не цешыць мяне.
От каб на ніве тваёй
Заняла я пастаць,
Каб на жніве тым
Магла ад цябе не адстаць.
Дзе там!.. Мінуцца
Студэнцкіх канікулаў дні.
Вас на крывенькім сярпе,
Паспрабуй, дагані.
Хіба дагоніш?
— А можна, —

Марына ў адказ.
— Як гэта?
— Ты праз ручай
Падавайся да нас,
Пераязджай, пакідай
Паплавы ды кусты.
Не на сярпе, на камбайне
Дагоніш тады.

Скончана дружная праца.
У зборы брыгада.
Чаркай абносіць
Прышоўшых з суботніка хата.
Дом пазабыты, калі ў ім
З'явіліся госці,
Зноў захадзіў, як нардом,
Ад буйной весялосці.
Пэўна, такога ніколі
Не сніў ён і ў сне.

Эй, гармонік, даволі
Вісець на сцяне!
Заіграй-жа, Сымон,
Заіграй весялей!
Болей пар на кругу,
Чым у доме людзей:
То з Марынай Максім,
То з Максімам Паліна,

То з Палінай Цімох,
То з Цімохам Марына,
То з Максімам Цімох.
Гарманіст, гапака!
Скача з лялькай-дачкою
Паліны дачка.
Круг шырэй, за акном
Скача дуб з яліною,
Круг шырэй, круг шырэй,
Скача поле з ракою!

У Цімоха і ў госці ягонай Марыны
Ёсць для новай сустрэчы старыя прычыны.

Ёсць старыя прычыны для новай размовы,
Зоры гэта пасведчаць нам лепей, чым словы.

Зоры свецяць ім так-жа сягоння над лесам,
Як даўней над расцвіўшым за школаю бэзам.

Мы, зазначу, здзіўляцца таму не павінны,
Што жывуць гэтак доўга старыя прычыны.

Колькі-б год ні прайшло, але з вуснаў не сцерці
Пацалунак той першы, што першы да смерці.

Могуць нашы шляхі разысціся з шляхамі,
Могуць больш не сысціся лісты з адрасамі,

Можа з часам астыць сэрца к сэрцу другому, —
Пацалунку-ж на вуснах гарэць па-былому.

У якім-жа ідуць яны зараз кірунку?
Што іх звязвае сёння, апроч пацалунку?

Можа новых прызнанняў гарачыя словы
Пацалункам другім сцвердзіць вусны гатовы?

Сотні год над зямлёй зоры свецяць у згодзе.
А для сэрцаў і год, іншы раз, як стагоддзе.

А праз некалькі год крыўдна, горка прыкмеціць,
Што ўжо так, як раней, сэрца сэрцу не свеціць.

Ён сказаў ёй, што хоча кідаць інстытут,
Быць яму земляробам: на хутары, тут.

З ім, — казаў ён, — гуляць нецікава цяпер:
Не студэнт ён, не будучы інжынер.

Ды і сам ён,—хай гэта не крыўдзіць гасцей,—
Як той лапаць, павінен трымацца лапцей.

А чаму так рашыў, па прычыне якой, —
Ведаць ёй нецікава. Не скажа ён ёй.

Што-ж пытаць?.. Хіба мала на гэта прычын
Тут, на хутары хоць-бы... дзе ён — не адзін?

Можа тая прычына, з сярпом у руках,
Сёння жыта з ёй жала ў тых самых лапцях?

— Што-ж, — Марына яму, — лапаць боту не пара,
Гэта праўда. Быць лапцем! Чым гэта не мара?

Стаўшы лапцем, трымайся, як лапаць, лапцей:
Разам з імі на печ, разам з імі ў музей.

Да цябе, — засмяялася госця вясёла, —
На экскурсіі будзе хадзіць наша школа.

Дзе, — пытаць будзе, — вучань былы мой Цімох,
Ці ўжо згніў, ці яшчэ топча лыкамі мох?..

На гулянку другі раз пайшла яна з ім,
Ён у клеці гарэлкі глынуў перад тым.

Ідучы з ёй, пра школу згадаў ён, пра бэз,
Смела госцю абняў, цалавацца палез.

Не скажу, што ў адказ атрымаў гаспадар,
Каб ізноў не змушаць чырванець яго твар.

Ён, з гулянкі прышоўшы, маўчаў, як сцяна.
А яна?.. Не пайшла з ім у хату яна.

Засталася ў бары... Чым вакол не сябры:
Рэчка, сена стажок, месяц, зоры ўгары.

Адшукаў яе ў лузе парою начной
Каля рэчкі Максім. Побач сеў. — Што з табой?

На каленях: касынка, дзве цёмных касы —
Ад туману вільготныя ці ад расы?
Ці яшчэ ад чаго?..

Запытала ў яго:
— Ці не час нам дамоў?..
Колькі разам шляхоў
Мы схадзілі з табой!
Недарма, дружа мой:
Ёсць, што ўспомніць. Ці праўда?..
— Рачулку лясную!
— Дождж у лесе...
Ага!
— Навальніцу...
— Старую
Яліну!.. — уздыхнуў ён,— шкада, што з табой
Заўтра пойдзем назад мы дарогай другой,
Што ўжо больш не заблудзім у лесе, як пойдзем,
Яліны той, рачулкі ніколі не знойдзем.
— Як, ніколі? — спытала з сяброўскай трывогай.
— Так, не знойдзем, відаць. Новай пойдзем дарогай.
— Дойдзем, як не да той,
Да другой яліны!...

За стажком, як за елкай, стаялі яны.

Пастаялі... Пайшла яна ў дом. Беражком.
Ён застаўся на сене ляжаць за стажком.
Ноч вакол, лес вакол,— непакоіўся мала,
Ён ляжаў-бы пад бурай цяпер, пад дажджом,
Пад маланкай той самаю, што пранізала
Змрок старой яліны незабыўным агнём.
Ён ляжаў... Ціхім жалем сціскаліся грудзі.
Не забудзе ніколі ён, не, не забудзе, —
Хоць і пойдзе з дзяўчынай дарогай другой, —
Яліны дарагой, пушчы той, буры той,
Светлай буры сваёй, што ў душы не сціхае.

Свет дрымотай ахутала ціша нямая.
Толькі ён не драмаў, ён ды зоры ўгары,
Ён ды месяц над ім.
        Закувала ў бары
Над ракой пасвятлеўшай зязюля начная.
Колькі ранняя птушка налічыць гадоў,
Столькі птушкай спяваць будзе ў сэрцы любоў.
Ён заснуў... А зязюля лічыла, лічыла...
Туманом яго рэчка, як коўдрай, акрыла.

Кніга карысная той каляндар адрыўны,
Што красамоўна глядзеў на гасцей са сцяны,

Ім гаварыў адарваны Палінай лісток,
Што не звычайны пачаўся сягоння дзянёк.

З гэтай пары для зязюль, што спявалі ў бары,
Дні галасістыя злічаны ў календары.

З раніцы гэтай, абвешчанай новым лістком,
Час надышоў, што завецца гарачым жнівом.

Што-ж, у дарогу, Марына, Сымон і Максім,
На дапамогу бацькам і калгасам сваім!..

Слаўна гулялі, цяпер папрацуйце як след.
Выйшаў на ганак Максім за Цімохам услед.

А за Максімам — з гармонікам выйшаў Сымон,
Выйшла Марына... З Палінай яна абнялася
На развітанне.
Ручай перайшлі, як кардон.
Крыкнула з-за ручая:
— Да спаткання ў калгасе!..

Да спаткання ў калгасе!.. Глядзеў са сцяны
На Цімоха з тугой каляндар адрыўны.

Не хаваў-бы сакрэтаў сваіх ад гасцей,
Можа-б стала, таварыш, на сэрцы лягчэй.

Брат Змітрок у турме, гэта ўжо не сакрэт,
Ты-б сказаў ім, дзе твой комсамольскі білет.

Расказаў-бы сябрам, па прычыне якой
Развітаўся вясной з комсамольскай сям'ёй.

У свой час не адважыўся, помніш, Цімох,
Расказаць ты, Што трапіў твой брат у астрог.

Вышла што? Час суровы... Сказаў комсамол,
Каб білет свой паклаў ты з кішэні на стол.

Вось і госці пайшлі... Нібы выбыў ізноў
Ты ў другі раз, Цімох, з комсамольскіх радоў.

Вось касынка, як сцяг той, мільгнула між дрэў,
Знікла там, і ў другі раз ты асірацеў.

Змоўклі песні, з дакорам глядзіць каляндар:
Што ты хочаш цяпер ад мяне, гаспадар?..

Не хаваў-бы сакрэтаў сваіх ды прычын,
Не сядзеў-бы тады
Ты ўсё лета адзін...
Твой-бы горкі настрой
Адлістаў я даўно,
А цяпер адзіноце
Канца не відно.

Госці з дому пайшлі... Дзень мінае, другі,
Трэці дзень з таго часу мінае.
Ні Цімох, што душою заныў ад тугі,
Ні Паліна спакою не мае.

На дарогу хлапец паглядае з акна.
Рвецца думкамі з цеснае хаты.
Не глядзіць на Паліну, нібыта яна,
Альбо ён перад ёй, вінаваты.

А Паліна? Заўважыў ён — з лесу прышла
У трывожным настроі з дачкою.
А пад вечар малую ў сяло адвяла,
Ходзіць бледная... Што гэта з ёю?

Павячэралі. Выйшаў на ганак Цімох.
А Паліна? Таксама. Пазбыцца трывог
Цяжка ў хаце маўклівай, пустой.
Села побач з ім. Што гэта з ёй?

Кажа гэтак хлапцу:
          — Як у радасным сне
Лета наша плыло дзень за днём.
Іншы раз, іншы дзень уяўляўся ты мне
Маладым маім гаспадаром, —
Як ты разам са мной
Вёў у поле дачку,
Як сядзеў ты з малой

У лясным халадку,
Як палуднаваў разам
Са мною, з дачкой —
З кубка піў аднаго ты,
Еў з міскі адной.
Іншы раз мне здавалася нават, што ты
Рад застацца са мной назусім.
Гэта праўда ці не?

Ён маўчаў. Сапраўды,
Гэта праўда. Ён думаў аб тым.
Гэта праўда, ён думаў... Жаданні свае
Ад яе хіба мог ён схаваць?
Каб не брат, не Змітрок, ён, напэўна-б, яе
Пакахаў, ён-бы мог пакахаць.
А яна? Недалёка і ёй да бяды,
Гэтаксама, напэўна-б, магла.
Тут Марына прышла... Што было-б сапраўды
Каб з сябрамі яна не прышла?
— Гэта праўда. Я прыязні нашай быў рад.
Ну, а хіба застацца са мной
Ты не рада была-б?

— Не кажы так. А брат?
— Я пра ўсё забываўся з табой.
Змітрака ты кахала?— пытаецца ён.—
Што не кажаш?

— Была закахана
Я ў Сцяпана, ты-ж знаеш...
— Што ўцёк за кардон,
Што цяпер там за пана Сцяпана?
— Ён не ўцёк за кардон.
Так ён з дому сышоў.
На Урале Сцяпан...
Як успомню я, зноў
Стыне кроў... Мне было восемнаццаць гадоў,
Калі я нарадзіла дачку.
Ён прывёў мяне ў дом да багатых бацькоў,
Пасядзела на кухні ў кутку
З дзіцем я — не пусцілі ў святліцу бацькі.
Кінуць іх не адважыўся сын.
Я таго дараваць не магла яму. Млын
Быў яму даражэй ад дачкі.
Як успомню я, сэрца сціскаецца... Лёс
Нада мной паглуміўся нямала.
Мне хапала ўсяго: ганьбы, горычы, слёз.
Можа толькі крыві не хапала.
Ты-ж пытаеш мяне: ці кахала?
Не кахала я, не да кахання было.
Жыць у час той было мне няміла.
Як у бубен, пра сорам мой біла сяло.
Выйсці замуж мяне ўгаварыла
Маці, цётка... Спакою тады, цішыні
Я хацела сабе... І Змітрок дзень пры дні
Угаварваў, — хоць ведаў, што я не магла

Пакахаць яго, — з ім надавацца з сяла
Жыць на хутар: «Прывыкнеш, развееш тугу
Сярод лесу, за працай у полі»...
Ды і думала я, што ўжо больш не змагу
Палюбіць анікога, ніколі.
Лепш забудзем. Забудзем усё, што было,
Што магло быць...

— Ты сёння хадзіла ў сяло?
— Так, хадзіла.
— Пакінула ў маці дачку.
Не гаворыш — чаму?

Сыч гукнуў у ляску.
Раз, другі раз. Устала.

— Спакою няма.
— Ты не ўсё мне гаворыш, Паліна.
Ты куды?
— Трэба мне. Не пытайся дарма.
— Да каго?
— Да таго, з кім павінна
Я сустрэцца.

Хусцінку — на галаву
І пайшла са двара... І за домам,
Як казала, сам бачыў Цімох, на яву,
Сустракалася з кімсь невядомым.

Як ішла з невядомым да жытняй капы,
Што складаў з ёй у полі сягоння,
Боль адчуў ён у сэрцы халодны, тупы,
Кроў, адчуў ён, ударыла ў скроні.
Ён-бы клікнуў яе, ён-бы крыкнуў з двара,
За лясной-бы спыніў пуцявінкай,
Каб не бліснула ў гэту хвіліну зара
Над палямі чырвонай касынкай.

4

Як Сцяпан уцякаў у той край, дзе паны,
Думаў жыць за панамі, як пан... Ды яны,

Хоць і стрэлі яго, як свайго, не далі
Ні надзейнае службы яму, ні зямлі.

Так сказалі, прывёўшы назад да мяжы:
— Там застаўся твой млын, ты яму і служы.

Будзеш верна служыць, абяцаем вярнуць
Млын табе, а не хочаш — адно не забудзь,

Што цябе мы, — яны не лічыліся з ім,—
Пад канвоем заставе совецкай здадзім.

Даў ён згоду пайсці, не задумваўся ён,
Шляхам тым, на якім, што ні куст, то заслон,

Лесам тым, у якім ён патайна, ў свой час,
Кантрабанду хаваў разам з бацькам не раз.

А цяпер? Перайшоў па загаду кардон.
Што тут робіць? Чаго тут бадзяецца ён?

Хутар гэты абраў незнарок ці знарок?
Сапраўды, — кут глухі, у астрозе Змітрок...

Сапраўды, можа знаў ён аб гэтым раней
Ці здагадваўся? Месца не знойдзеш зручней.

Можа ўбачыць Паліну хацеў ці дачку?..
Падсцярог ён нарэшце іх у дубняку.

Сэрца маці, напэўна, крануў ён слязой,
Успамінам расчуліў, — яна
З ім сустрэцца згадзілася... З ёй над ракой
Размаўляў ён амаль да відна.

— Ты дарэмна злуешся. Не вінен я ў тым,
Што асуджаны муж твой... Не вінен зусім.
А што ўцёк я адгэтуль? —
Прычына — бацькі:
Каб не ўцёк я —
Саслалі-б на Салаўкі.
— А цяпер?..
— Маю пашпарт, прапісалі як след.
Я паказваў табе.
— Што-ж, схадзі ў сельсовет,
Заявіся... Усё яны высветляць...
— Не.
Заяўлюся: адразу-ж пад варту мяне,
Покуль суд, перасуд той —
За краты...

Хіба-ж я, аж з Урала, ляцеў-бы сюды,
Калі-б быў хоць у чым вінаваты?
Пойдзем разам, Паліна.
— Куды?
— Хоць куды...
Жыць без любае годзе мне, годзе!
— На якім ты працуеш заводзе,
Што не кажаш?..

— Кінь думаць аб Змітраку.
Не скажу, колькі-б ты ні пытала.
А заявіш, што тут я, ізноў уцяку —
Гарадоў і заводаў нямала.
Думаць кінь...

— Ты не хочаш ісці ў сельсовет,
Мне не верыш, баішся... Чаго?
Не дурная з табою я ехаць за свет,
Што я ўкрала, забіла каго,
Ці пакрыўдзіла?.. Просьба твая не кране
Сэрца матчына... Я не паеду.
Гэта ты разам з бацькам пакрыўдзіў мяне,
З ім цяпер і цягайся па свету.
Ты-ж бацькоў дзеля нас не пакінуў тады,
Млын табе даражэй быў... Ну што-ж,
У спакоі цяпер нас пакінь назаўжды,
Ні дачку, ні мяне не трывож.
Каб любіла і то-б, з-за дачкі з-за свае,
Я за бацькам такім не пайшла.

— Дзе яна? Ад мяне ты хаваеш яе,
У сяло адвяла?,.
— Адвяла.

Знаць не хочам цябе, чуць не хочам імя.
Разышлася з дарогай дарога:
Ты — дзяцюк халасты, а ў мяне тут — сям'я,
Муж...
— За кратамі муж твой.
— Нічога,
Абяцаў адвакат —
Муж мой выйдзе з-за крат.

— Ты калісьці кахала мяне.
— Што калісьці было —
За вадою сплыло.
— І ніколі не вернецца?.
— Не.

— Што-ж, трывожыць пакіну я вас... Уступлю.
— Не пакінеш: пайду ў сельсовет, заяўлю...
— Пачакай заяўляць. Не спяшайся.
— Чаму?
— Пабяжыш — на дарозе ў бары перайму.
Пачакай.
— Не трывож мяне, чуеш? Ідзі
Ты дарогай сваёй, я — сваёй.
Паміж імі — граніца. Яе перайсці
Ні яму немагчыма, ні ёй.

На світанні, пакінуўшы хутар, Цімох
Крочыў сцежкай лясною, дзе верас ды мох.

Так ляцеў — толькі вецер свісцеў па баках.
Заўтра дзень кірмашовы ў сяле Сілічах,
Там, ён ведае гэта, збяруцца сябры...

Прагным вухам лавіў, днём не чутны ў бары,
Працы гул на далёкім арцельным двары.

Пакідаў адзіноту сваю, цішыню,
Як той ветразь, што ў мора плыве ўпершыню,

Што жадае ўцячы ад маўклівай тугі
На шырокі прастор, свет пабачыць другі.

Бор. Сасновыя шаты.
Ды верас. Ды мох.
Чалавек барадаты.
Цяпельца. Дымок.
— Эй, куды ты, браток?..
Не спяшайся, браток!
Каля ног — торба з хлебам,
дарожны кіёк.
— Што, ніяк не пазнаеш?
Я — брат твой... — Змітрок,
Ты?!. — Як бачыш.
— З астрогу? — Не бойся, не ўцёк.

Разабраліся, браце...
Сядай, дарагі.

Сеў Цімох ля цяпельца
на верас сухі.

— Не глядзі, што я чорнай зарос барадой,
Не зарос барадой, а зарос я бядой.

Не дзівіся таксама з убораў маіх,—
Гора красіць, Цімох, толькі ракаў адных.

Сам ва ўсім вінават... Сам калісьці палез,
Як у пастку, Цімох, я з Палінай у лес.

Думаў, жонка пазбудзе там ганьбу і сорам,
Думаў, там са сваім расквітаецца горам,

Сосны боль закалышуць, развеюць тугу,
Думаў, з жонкаю шчасце знайсці там змагу.

Ну, а ліха такіх і пільнуе людзей,
Ліха любіць само кут, які пазмрачней

З'еш адзін кабана, —
Чэсць, як кажуць, адна.
З'еш адзін хоць вала,—
Адна чэсць і хвала.
Аднаму, без людзей,
Ліха ў сто раз люцей.

Вось і стала варыць так, як рака, мяне
Гора ў чорным сваім хутарскім чыгуне.

Кантрабанду не проста падкінулі, не!..
Кантрабанду прынёс і схаваў у гумне
Не абы хто — Сцяпан..,
На гумно к нам занёс,
Сваяка папрасіў:
напішы, брат, данос.
Сам-жа ўцёк за мяжу:
паспрабуй дакажы,
Што не вінны,
пакліч паспрабуй з-за мяжы.

Правакацыя, брат...
Помсціў мне за бацькоў,
За дарогу, якую
да Салаўкоў
Паказалі мы ім...
Помсціў жонцы маёй.
Эх, і шкода, што ўцёк ён,
што ён за мяжой!
Я злавіў-бы яго,
млынара, за руку,
Я яму паказаў-бы,
чым мелюць муку.
Сам судзі ў-бы яго,
сам павёў-бы ў турму,

Сам у лесе асіну
знайшоў-бы яму.
Каб не ўцёк — у яго
змог-бы ўсё распытаць,
Як ды што... — Ён не ўцёк,
на Урале — чуваць.
Мне Паліна казала...

Цімох замаўчаў.
— Ну, а Поля, як Поля? —
Змітрок запытаў.
— Хтось туляецца,
хтось паглядае з-за дрэў
На твой дом... Сярод ночы...

Змітрок пабялеў.
Вочы бліснулі ярка,
як два вугалі,
Сам, нібы на вуглях,
ён падскочыў з зямлі:
— Можа тут гэты гад?!
— Не прыкмеціў я, брат...

— Можа тут? Я прыкмечу...
Жалезны капкан
Я пастаўлю яму.
Пачакай-жа, Сцяпан!..

Торба з хлебам
ужо на кійку за спіной.

Затаптаў ён цяпельца,
прысыпаў зямлёй.
— Суха ў лесе, — сказаў,—
Не дагледзіш — пажар.
Тут цяпер не астрожнік я,
А гаспадар.
Ты сабраўся куды?
— Я ішоў да сяброў.
Ды, як бачу я, трэба
Вяртацца дамоў,
Раз такая сустрэча.
— Не трэба якраз.
Са Сцяпанам — рахункі
Сур'ёзныя ў нас.

Да Паліны Змітрок
не паказваўся днём.
Як сцямнела — сядзеў
гаспадар за сталом.

Як сказаў адвакат —
Муж вярнуўся назад.

Падавала Паліна
Вячэру яму...
Расказаў — праз каго
Трапіў ён у турму.
— Эх, злавіць-бы падлюгу,
Даставіць у суд.

Дзе ён, можа быць чула?..
— Туляецца тут.
— Што ён хоча?
— Прыехаў, гаворыць, за мной,
За дачкой... Я зусім
Свой згубіла спакой.
— Заявіла-б і ўсё.
— Гэта лёгка сказаць:
Абяцаў на дарозе ў бары пераняць.
Чую: сочыць за намі
І ноччу і днём.
Заяві, а ён дом
Ноччу пусціць з агнём.
Калачуся, маўчу,
Нібы мыш у мяшку.
Добра, ты вось прышоў...

Сыч гукнуў у ляску.

— Гэта ён. Чуеш, свішча?
— Я свісну яму.
На дарозе яго
Сам пайду перайму!
— Што ты, кінь, не заводзься.

Устаў з-за стала.
— Я пайду, ты — чакай,
Не запальвай святла.

Той нечы, калі месяц з-за лесу ўставаў,
Сустракаўся Сцяпан з тым, з кім стрэчы чакаў.
— Пан Даўбніцкі? —Цішэй...
Ты — не хлоп, я — не пан,
Я — Сямёнаў Пятрусь,
Помніць трэба, Сцяпан.
— Выбачайце, даруйце мне,
Пан капітан...
— Я — таварыш Сямёнаў...
Даўно з-за мяжы?
— Ды даўно ўжо чакаю.
— Ну, што тут, кажы...
Тут сядзеў ты ўвесь час?

— Адлучаўся ў калгас —
У найлепшы... Два дні
Дабіраўся пяшком,
Дзве выдатныя фермы
Пусціў там з агнём.
— Ну, а тут — не чапаў?
— Тут — спакой: воўк і той
Не чапае авец
Бліз бярлогі сваёй.
— Як малодка? Як хутар?
— Ды так сабе, так...
Не дамовіўся з ёю,
Не выйшла ніяк.
— Быў-бы хутар яе

Добрай яўкай, аднак.
— Я чакаў, не прышла сёння...
— Чуў я твой свіст.
Свішчаш ладне!.. Хто муж яе?
— Муж? Актывіст
Быў калісьці... У знакі нам
Даўся такі —
Камітэтчык!.. Яго
Не забудуць бацькі
Там, за тундрай... Жаніўся —
Стаў менш баявым.
Ды не доўга падыхаў
Спакоем лясным
Ён з малодкай сваёй...
Цішыню і спакой
Хутка я яму даў
За астрожнай сцяной.

Закурылі на беразе
соннай ракі —
Засвяціліся
па рукавах аганькі.

— Так... Гаворыш, не ўдаўся
Любоўны паход.
Што яшчэ?
— Ёсць загад мне
Падацца на ўсход.
Прабівацца, загад ёсць,

Ажно на Урал.
— Адмяняю загад.
Там — няшчасце... Правал.
Там правал.
Але важныя весткі — пры мне
І паперы, якія
Патрэбны вайне.
Пойдзеш разам са мною
Назад за кардон.
— Эх, таварыш Сямёнаў,
Што куст, то — заслон.
Колькі зораў блішчыць,
Столькі сочыць вачэй.
Эх, праз гэтае пекла

Хадзіць-бы радзей.
— Цыц, шчанё... Колькі год табе?
— Мне? Дваццаць пяць.
— Можа быць, для спакою
Цукерачку даць?
Зброя ёсць?
— Карабіны. Схаваў пад карчом.
Адкапаць загадаеце?
— Заўтра ідзём.

Падлічылі: калі
кіравацца напрост —
Да граніцы не меней,
чым сорак вёрст.

Заўтра дзень кірмашовы
ў сяле Сілічах,
Дзень выгодны: Ілля,
шмат людзей на шляхах,
Хто ідзе, а хто едзе
на захад, на ўсход.
Самы раз гэткім днём
ім пачаць свой паход.
Парашылі як след
адпачыць уначы,
А ледзь свет
падавацца на Сілічы.
На гадзінніку — роўна дванаццаць гадзін.
Вось з дрымотных прастораў начных
Шум данесла рака...— Што за шум?— Гэта млын,
Што ў бацькоў адабралі. маіх.
Прагным вухам Сцяпан прыпадаў да трысця:
Шум далёка чуваць па вадзе,
Шум старога млына, шум былога жыцця,
Што цяпер нямаведама дзе.
Слухаў ён, сам з сабой размаўляў, як п'яны:
«Я вярнуся на гэту зямлю.
Пасяку ўсе сады, папалю ўсе млыны,
Хаты чорным агнём спапялю...»
Так шаптаў ён пад шум, што даходзіў здалёк.
Працаваў, не сціхаючы, млын.

Той начы зноў дадому з'явіўся Змітрок
Непрыкметна ў дванаццаць гадзін.

... Растлумачыў каротка, што трапіў на след
Дыверсантаў, знайшоў іх бярлогу.
Загадаў, каб Паліна ішла ў сельсовет
Падымаць баявую трывогу.

Каб сказала, што хочуць бандыты ўцячы,
Што трымаюць свой шлях на сяло Сілічы,

Дзе з'язджаецца заўтра народ на кірмаш.
Сам-жа стрэльбу старую дастаў, патранташ,

Браў дранкулі, якія даўно для ваўкоў
Спецыяльна хаваў. Ежы ўзяў і пайшоў
З дому ў лес.

Блізкай дзічы
Учуяўшы пах,
Ён, нібы паляўнічы,
Пайшоў па слядах.

5

Рух кірмашовы
пачаўся ў сяло Сілічы
З першай паловы
перадкірмашовай начы.
Грукатам кол
ён пачаўся, рыпеннем вазоў
З вёсак далёкіх ды сёл,
ды глухіх хутароў.

Ноч паступова
дрымотай ахутала шлях.
Рух прыпыніўся часова
на палявых бальшаках.

Як мінула, прайшла
Ноч, са ўсіх бальшакоў палявых
Дым папоўз да сяла
З неастыўшых стаянак начных.

То курыўся з-пад колаў,
Як дым уначы з-пад галля,

Пыл... як-быццам наўкола
Сухая гарэла зямля.

Быццам гэта праз поле
Агонь пакаціўся адтуль,
А не яркае полымя
Хустак, сукенак, кашуль.

Яркі дзень кірмашовы!
    Я ў сэрцы твой гул берагу.
Памятаю, не раз
    твой шумлівы прыход на шляху
Сустракаў я ў свой час...
    У той жнівеньскі дзень, што ні год,
Усім выпускам школьным
    збіраліся мы, як на злёт.

Я наведаў кірмаш
    у нядаўнія, нашы, часы.
Там з падводамі побач
    стаялі на плошчы ЗІСы,
Прадавалі ў палатках
    арцельны тавар ганчары,
А ў ларках садаводы —
    калгаснага лета дары.
Прыслухоўваўся там да дзядзькоў,
    да кабет, як ішоў,
Ды ў радах кірмашовых
    ранейшых не чуў я размоў

Пра таго дзецюка,
што ў кагосьці сцягнуў гусака,
Пра ваўка, што з двара
звёў за вуха у лес парсюка,
Пра няшчасную маці,
якую прагнала дачка...
Чуў размовы другія,
чуў іншыя песні зусім, —
Аб тым моры Цымлянскім,
аб станцыі новай, аб тым,
Як шчаслівая маці
гасцей прычакала здалёк,
На ўвесь край наш вядомых,
любімых сыноў і дачок.
Я наведаў кірмаш...
Дзе мае дарагія сябры?
А ці, можа, забыўся ўжо
звычай юнацкай пары?
Час у тым вінават,
а ці справы, якіх у нас шмат?
Не сваіх, а другіх
там убачыў хлапцоў і дзяўчат.
З пачуццём трапяткім,
нібы ўслед за юнацтвам сваім,
Я за імі ішоў,
пра сябе падпяваючы ім.
Песня гучна пляскалася
у кірмашовых радах,

Як віно маладой
      ў старых шматвяковых мяхах.

... Пачынаўся вось так
      і кірмаш у сяле Сілічах.

З гучнай песняй студэнты
      прайшліся па ім грамадой,
Той кірмаш, нібы сход,
      адчыняючы песняй сваёй,
Нібы ён, як той сход камсамольскі,
      пачацца не мог
Б ез іх песні бадзёрай,
      прышоўшай з шумлівых дарог.
Іх саміх, як на злёт,
      як на мітынг, прымала сяло,
Дзе тым часам якраз
      і начальства з райкома было.
Сакратар, што сюды на кірмаш
      завітаў пасля спраў,
Іх, нібы дэлегатаў,
      прыбыўшых з раёна, вітаў.
Ён прайшоў з імі разам кірмаш
      ад канца да канца.
   Да тавараў прыцэньваўся
      з выглядам пакупца,
   Да размоў прыслухоўваўся
      каля сялянскіх падвод,

Сам з людзьмі размаўляў...
Гаварыў пра спякоту народ,
Пра сухмень нечаканы,
які прыхапіў ярыну.
Пра паноў, што за блізкай граніцай
рыхтуюць вайну,
Гучна зброяй сваёй
выхваляючыся на ўвесь свет...

Тут з трывожнаю весткай
прыслаў пасланца сельсовет.
Пагранічны раён.
Дваццаць вёрст ад сяла да мяжы.
Не ўдалося ад спраў
адпачыць яму на кірмашы.

Сельсовет...
— Комуністы, ў нардом! Комсамольцы,
ў нардом!.. —
З сельсовета трывожны загад
паляцеў кірмашом.

Даганяў ён студэнтаў,
што з песняй ішлі між падвод.

Як ішлі, так пайшлі комсамольцы
праз плошчу на сход.

Цішынёю суровай і строгай
Сустрэў іх нардом.
Сцэна. Стол. Над двухвёрсткай
Сядзеў сакратар за сталом.
Дубальтоўкі, вінтоўкі, бярданкі
Сабраны ў куток...
І хаця працаваў пры нардоме
Вайсковы гурток,
Толькі ў гэту хвіліну
Было зразумела для ўсіх,
Што сюды не на збор на вучэбны
Паклікалі іх,
Што, таксама, не п'есу
З часоў грамадзянскай вайны
Бачаць гэтай хвілінай
На сцэне нардома яны.
Сакратар уставаў з-за стала
І ў суровай цішы
Да прысутных звяртаўся
Са словамі:
— Таварышы!..
Толькі што пазваніў нам
Кавычанскі сельскі совет:
Дыверсанты адтуль
На кардон падаліся ледзь свет.
Знішчыць іх мы павінны
Атрадам сваім баявым,
Да заставы — далёка,

Нам дзейнічаць трэба самім.
Дысцыпліну захоўваць,
Жалезны парадак. Спакой.
Комуністы, — за зброю,
Комсамольцы, — за зброю,
За мной!..

Міма лірнікаў, міма шумлівых
Сялянскіх падвод
З комуністамі разам
Ішлі комсамольцы ў паход.

Аднаго з імі толькі Цімоха
ў той час не было.
Ён сачыў з кургана,
як выходзіў атрад за сяло.
З даўніх пор на сяле,
за царквой, узвышаўся курган,—
За атрадам адтуль назіраў ён,
залёгшы ў бур'ян...
Вось сябры яго
мост перайшлі... За ракой, за мастом
Па загаду сакратара
пачалі ланцужком
Рассыпацца па полі,
як трэба — адзін за адным,
Ачапляючы з захаду лес.
Там — Марына, Максім...

І Міхась, і Сымон —
быў, напэўна, з гармонікам ён.

Хваляваў яго гэты малюнак,
і ўладна здалёк
Вабіў яркай чырвонай касынкі
жывы аганёк:
Вось ён знік за бугром,
вось успыхнуў ён на бальшаку.

Як-жа стацца магло,
што застаўся Цімох у баку?
Што сябры аб ім скажуць?
А скажуць аб ім, — не сакрэт,—
Што ён трус, што ён ганьбай пакрыў
комсамольскі білет...
Не сказаў ім Цімох,
што ў нардом ён з'явіцца не мог,
Што расстаўся вясной
з баявой комсамольскай сям'ёй.
Хіба праўда ўсё гэта?..
Зрабілася раптам яму
Горка, крыўдна да слёз
у глухім бур'яне, аднаму.
Горыч сціснула грудзі,
у горле засела камком,
Наваколле на момант
заслала ў вачах туманам...

Ён пабег з кургана. Вось рака.
Вось і мост. Перад ім —
Поле, лес за тым полем...
У месцы адным, у другім
Белы ўбачыў ён дым... Лес гарэў.
Ланцужком баявым,
Поўвярсты не дайшоўшы да лесу,
на полі залёг
Комсамольскі атрад. Вось пачуў
страляніну Цімох.

Вораг першы заўважыў
атрад комсамольскі з-за дрэў,
Хмыз сухі падпаліўшы і верас,
агнём яго стрэў.
Стралянінай гарачай
кароткі закончыўся бой.
Лес, смалісты, пад ветрам успыхнуўшы,
дыму сцяной
Даль ужо засцілаў...

Блізкі гул кірмаша за спіной
Не сціхаў, колькі часу Цімох
прастаяў над ракой,
Потым кінуўся бегчы,
але не туды, дзе атрад,
А на шум кірмашовы
ён кінуўся бегчы — назад.

Неўзабаве адтуль, дзе ён знік,
Гул глухі даляцеў,
Быццам буры парыў
У магутных вяршалінах дрэў,
Быццам поезда рух
На далёкай дрымотай вярсце,
Што мацнеў сярод лесу,
Памножаны ў кожным лісце.

Ён дужэў, нарастаў,
Ён каціўся бліжэй і бліжэй,
Неслі гул перакатны з сабой
Грудзі соцень людзей.

Іх узняў па трывозе
Цімох з кірмаша на пажар.
Беглі людзі напрост —
Цераз мост, цераз луг — на папар.

Год з вясны быў засушлівы,
З чэрвеня лес быў сухі,
А ўжо з ліпеня — заараны
Лясныя шляхі.
Днём і ноччу з трывогай
Хадзілі па іх леснікі,
Як ля складаў парахавых
Насцярожаныя вартаўнікі.
Сярод лета лугі парыжэлі,
Пажоўклі кусты,

Як трухлявыя галавешкі,
Курылі вакол белаты.
Чорным пылам пад ветрам
Клубілася чорная гаць...
Лес не проста ў час гэты
Падпалены быў, як відаць.

Беглі. Дымам і іскрамі
Вецер дыхнуў ім у твар.
Пад нагамі натоўпу
Сухі задыміўся папар.

Ветрам гнаны агонь
Разрастаўся — на захад, на ўсход,
Сакратар — Клім Бударын —
Сабраў каля лесу народ.
Растлумачыў усёй
Грамадзе, што сабралася, ён:
Вораг лес падпаліў,
Уцякаючы за кардон.
Толькі ён, вораг той,
Ад сябе не адхіліць удар:
Хто агонь тут насеяў,—
Смяротны пажне тут пажар...
Растлумачыў задачу
І, лішніх не трацячы слоў,
За сабою людзей,
Як салдат на змаганне, павёў.

6

Асцярожна ступаючы,
Сціснуўшы стрэльбу ў руках,
Ён, нібы паляўнічы,
Ішоў па слядах.

Цёмным лесам Змітрок
Увесь час ідучы,
Чорны след дыверсантаў
Згубіў уначы.

Ён ішоў наўздагад...
А калі раніцой
Стралянiну пачуў,
То падаўся на ёй,
Шлях трымаў на яе
Ад сасны да сасны.

Ён прыбег, калі, лес
Падпаліўшы, яны
Адыходзілі ўжо

У гушчар. На бягу
Уляпіў ён Даўбніцкаму
Кулю ў нагу.

Той упаў... А Сцяпан
Разгубіўся зусім,
Напалоханы стрэлам
Раптоўным такім,
Скочыў з месца, як воўк...
Паляўнічы — за ім.
Пан Даўбніцкі стагнаў,
зваў Сцяпана. Дарма.
Раз паклікаў, другі раз.
Адказу няма.
Хутка ён зразумеў,
што застаўся адзін.
Апіраючыся на пусты карабін,
Рану перавязаўшы,
кульгаў дацямна.
Уцякаў ён, а следам —
пажару сцяна.
Дзень кульгаў ён, другі.
Трэці дзень на нагах,
Хоць хістаўся,
жывёльны трымаў яго страх.
Грудзі крыўда душыла,
шалёная злосць.

Заяц збіў яго з ног,
таптануў яго лось.
Гад хацеў абагнаць,
ды яму галаву
Ён прыкладам разбіў
і... зваліўся ў траву.
Але тут-жа з трывогай
зірнуў ён назад
І па жорсткай траве
сам папоўз, як той гад.
Так па лесе
гадзіну ён поўз не адну.
Уцякаў ён, ды раптам
пажару сцяну
Ён убачыў наперадзе...
Дымам у твар
І смяротным агнём
грозны дыхаў пажар.

Ля будынку станцыйнага,
Каля чыгункі самой,
Каля складаў яе
Лес узняўся маўклівай сцяной.
Там-жа ў лесе стаялі,
Якраз на пуці запасным,
Пад пагрузкай вагоны —
З-за дроў іх не відна зусім.

Там-жа— проста пад дрэвамі —
Шпал запасных штабялі.

Пад пагрозаю станцыя,
Склады, вагоны былі.

Дзень і ноч комсамольцы на дол
Лес валілі вакол,
Ні сваіх но шкадуючы сіл,
Ні сякераў, ні піл.
За чыгунку цягалі
Той лес, што ад пілаў палёг,
Хворасг той, каб агонь
Зачапіцца за хворасг не мог.

Хоць прымусілі лес
Адступіць яны... Ды не на шмат.
Набліжаўся агонь...
«Не ўратуеш чыгунку ад страт», —
Бедавалі Максім і Марына,
Бо ім сакратар
Даручыў гэту справу...
А тут... набліжаўся пажар.

Набліжаўся агонь... «Не ўратуеш...»—
Відаць было ўсім.
— Што, каб лес запаліць нам? —
Спытаўся ў Марыны Максім. —

Гэтак дзядзька рабіў мой,
Ён служыць даўно лесніком.
Гасяць, чуў я, пажары лясныя
Сустрэчным агнём...

Комсамольцы чакалі... Загад
Па радах баявых
Паляцеў: — з лесу ўсіх!
— З лесу ўсіх!
— З лесу ўсіх!..
А за ім следам новы загад
Паімчаў па радах:
— Лес паліць!.. — і дымкі
Дружна ўспыхнулі скрозь па кустах.
Быццам гэта байцы
На агонь адказалі агнём.

Хутка полымя ніз залівала,
Нябачнае днём.
За паводкаю полымя
Вочы сачылі па тым,
Як чарнелі вакол верасы,
Што заліты ўжо ім.
Хмыз сухі, як раскіданы порах,
Шумліва гарэў,
Бег агонь непрыкметны
З патрэскваннем грозным між дрэў
Вось ён вось дабяжыць
Да крытычнае кропкі сваёй

І, здаецца, ад выбуху лес
Узляціць над зямлёй.
Цягай гнаны агонь
Бег імкліва насустрач агню.

Раптам крык,
Немы крык,
З лесу крык страсянуў цішыню.
Крык такі, быццам нехта
Там гінуў у нетрах глухіх.
Можа хто не паспеў са сваіх
Выйсці з нетраў лясных?
Пабляднела Марына...
Ды ўжо не адменіш загад,
Стаў агнём ён, якога
Вярнуць немагчыма назад.
Пабляднела, зірнула
З трывогай таварышу ў твар.
Зразумеў ён, сам кінуўся
Моўчкі ў агонь, у гушчар.

Ёсць секунды ў жыцці,
За якія рашаецца лёс.
Вышаў з полымя ён,
Сам ахоплены полымем... Нёс
Невядомага з лесу:
Прытомнасць яшчэ ў гушчары
Страціў той... Ім насустрач

Максімавы беглі сябры.
З невядомым зваліўся Максім
На зямлю ля сасны,
Не данёс да сяброў...
Пінжакамі, рукамі яны
Збілі з кепак гарэўшых,
З іх вопраткі — полымя, дым.
— Што з табою, Максім?
Ён маўчаў.
Сам не ведаў, што з ім,
Твар агнём быў абпалены.
Рэзала вочы святло.

Лес гарэў... Ён не бачыў,
Як полымя ў наступ ішло,
Як магутнаю хваляй —
Максіму было не відно —
На варожую хвалю агню
Наляцела яно
І як згінула з ёй у бары,
Нібы ў цёмным віры...

Не маглі баявога
Стрымаць захаплення сябры,
Дружным крыкам віталі
Прыход перамогі сваёй.
Хвалі полымя гінулі
З гулам, адна за адной,

Абсыпаючы іскраў мяцеллю
Будынкі, людзей.

Ён не бачыў… Ад болю
Не мог ён расплюшчыць вачэй.

За Сцяпанам — Змітрок:
след у след, крок у крок.
І адзін і другі
ледзьве ногі валок.
Прытаміліся ўжо,
ідучы дзень і ноч,
Ні на момант са зброі
не зводзячы воч.
Асвятляла ім зарава
сцежку ўначы.
Ад пагоні не проста
Сцяпану ўцячы.
Трэба лесам ісці,
гушчаром, ведаў ён,
Бо на ўзлессях цяпер,
што ні куст, то — заслон,
Колькі зораў блішчыць,
столькі сочыць вачэй.
Узнялі пагранічнікі —
знаў ён — людзей.

Патаемнымі сцежкамі,
ноччу і днём,
За сцяною агню
ён ішоў гушчаром.

Так прышоў да кардону ён
са Змітраком.
Гаварыў Змітраку
блізкі гул трактароў,
Што граніцу
Сцяпан яшчэ не перайшоў.
Але пільна за ім
ён сачыў... І па тым,
Як Сцяпан прыглядаўся
да сцежак, да дрэў,
Што мяжа недалёка, —
Змітрок зразумеў.

Хоць Сцяпан і Змітрок — родам з вёскі адной,
Ды жыццё іх даўно раздзяліла мяжой.

Не дружылі малымі таму, што не мог
Дом Сцяпанаў пусціць Змітрака на парог.

Дзецюкамі супольных не зналі дарог —
Млын Сцяпанаў таго ім дазволіць не мог.

Меў адзін — сад і млын, а другі — сам-адзін,
На работу наймаўся ў той сад і ў той млын.

Тут, у лесе, дзе зноў іх сышліся пуці,
Паміж імі — мяжа, што прайшла па жыцці...

На адлегласці часам
размовы вялі.
— Адпачнём?..
На лясной адпачылі зямлі.
— Дзе такую, Змітрок,
адрасціў бараду?..
— Хутка ўбачыш... Цябе
я ў той дом прывяду.
— А навошта? —
Сцяпан падражняў Змітрака. —
Чым цягацца
ды бахаць з драбавіка,
Лепш вяртайся дамоў,—
пагражаў яму ён, —
Будзе горш, як цябе
завяду за кардон.
Моўчкі стрэліў Змітрок
зноў са стрэльбы сваёй.
Адаслаў у паветра
апошні набой —
Свой сігнал пагранічнікам
з пушчы глухой.

Паміж імі цяпер іх мяжа пралягла
Не гасцінцам, што млын аддзяляў ад сяла,

Не звярынаю сцежкаю ў пушчы глухой,
А граніцай двух светаў, дзяржаўнай мяжой.

Той граніцай, што дзеліць за круглым сталом
Дыпламатаў нябачным сваім паяском;

Той, што стужкай чырвонай у нашыя дні
Дзеліць праўду і мір ад вайны і хлусні;

На якую ізноў з той, з чужой, стараны
Сёння падаюць змрочныя цені вайны;

Праз якую, з другіх цёмных пушч і дуброў,
Зноў паўзуць пасланцы тых-жа самых штабоў.

— Адстраляўся!? —
Сцяпан з карабінам пустым,—
Што пусты ён,
Змітрок знаў даўно ўжо аб тым,—
Апынуўся за момант адзін
перад ім.
Стрэў Сцяпана Змітрок,
як баец, як салдат.
З гучным трэскам разбіўся
прыклад аб прыклад.
Па карэннях качаліся,
па дзеразе.

То адзін, то другі
Бралі верх па чарзе.
Хто задушыць каго
На паляне лясной?
Да варожага горла,
Нарэшце, рукой
Дацягнуўся Змітрок.
Ды не ўбачыў Змітрок
Фінкі... Фінкай Сцяпан
Парануў яму ў бок.
Скончана... Выцер кроў
Аб траву-дзеразу.

Сцежка лясная
адкрыта яму за мяжу.

След свой спачатку
пасыпаць хацеў тытунём,
Потым, махнуўшы рукою,
бандыт напралом
Кінуўся сцежкай глухой
на штыкі і на кулі
Падрыхтаваныя:
стрэл пагранічнікі чулі.

Куля дагнала бандыта
На сцежцы лясной.
Ён пахіснуўся,
Упаў на зямлю... за мяжой.

7

З песняй ішлі яны
блізка граніцы заходняй.
Скончыўшы толькі што
бітву з пажарам лясным,
Шляхам ішлі
камсамольцы ў калоне паходнай,
Блізка граніцы
ў парадку ішлі баявым.
Іх валасы не ад пылу
таго пасівелі,
Што ад іх крокаў
з сухой падымаўся зямлі,
Спаленых іглаў сасновых
сівыя мяцелі
Разам з агнём
над галовамі іх адгулі;
Бровы зліняли,
але не абпалены сонцам
І не вятрамі
на летніх гарачых шляхах, —

Іскры пажару нядаўняга
роем бясконцым
Яшчэ дагэтуль
у іх мітусяцца вачах.

Поле. Прывал.
Стогадовыя сосны, яліны
Шумам віталі іх
На скрыжаванні дарог.

— Слухай, Марына,—
Звяртаўся Цімох да дзяўчыны —
Разам з усімі з пажару
Вяртаўся Цімох.
— Не разумею, — казаў ён,—
Як стацца магло так,
Што за прычына?..
Ці час вінават, што каротак,
Што для размоў нам
Яго не хапала з табой?
Ці што другое, магчыма,
Было тут віной?..
— Што тут пытацца, здзіўляцца...
Ты лепей скажы,
Як гэта знік ты, прапаў ты
На кірмашы?
Хлопцы смяюцца, што струсіў...
— Смяюцца дарма.

— Зганьбіў, гавораць, білет свой...
— Якога няма?
— Як гэта? Выключай ты?..
— Разумееш сама.
— Што-ж ты маўчаў?
— Я сабе даравацъ не магу

Нашай размовы і ростані,
Там, на лугу...
Цяжка было мне,
Зашыўся ў мядзвежы куток.
Я... разгубіўся.
Цяпер, як з'явіўся Змітрок,
Стала лягчэй, бо віна мая
Звязана з ім...
— Пэўна, вось так-жа маўчаў ты,
Што з братам тваім?
— Што я сказаць мог? Падумай.
Нявінны мой брат.
— Ты і тады, як прышлі мы,
Не вельмі быў рад.
— Цяжка мне думаць было,
Што не будзе ў нас згоды,
Згадваць спатканні,
Не вернуцца, думаў, яны...
Згадваць аб тым, як калісьці
Хадзілі на сходы,
Як нам спяваць салаўі

Пачыналі адны...
Помніш? Мы слухалі іх?

— Сёння гэтага мала:
Буры ўжо сёння спяваюць
На нашым пуці...
Я вось сустрэцца з табою,
З такім, не чакала,
Што разгубіўся
Ад першай няўдачы ў жыцці,
Што прамяняў нас
На хутар з яго цішынёю:
Лес ды Паліна,
Ды спеў перапёлкі ў кустах.
Сам разумееш: не лапці-ж
Нам плесці з табою...
Дзякуй вялікі
За згадку аб салаўях.

Зноў комсамольцы
            выходзілі строем на шлях.

Лёгкая брычка
Дагнала каля пераправы.
Крыкнуў баец з яе:
— Хто Прыгароўскі Цімох?
— Я... — Загадаў тэрмінова
Начальнік заставы

Ехаць са мной вам...
І вось — паімчалі. Удвох.

Вось і застава.
Цімох у дзяжурным пакоі.
Ложак байца. На тым ложку
Ляжаў яго брат.
Глуха спявалі за вокнамі
Елкі і хвоі
Грозную песню...
— Мне жыць засталося не шмат.
Бацька будзёнаўцам быў наш,
Загінуў са славай.
Я паміраю не так...
Але ўсё-ткі лягчэй
Тут мне пад сцягам ляжаць,
Што гарыць над заставай,
Нібы ляжу на вачах
У мільёнаў людзехі.
Хутка канец... Пахавай ты
Мяне не ў глушы,
Цела адгэтуль
Нікуды майго не вязі ты,
Тут пахавай ты мяне,
Як байца, на мяжы,
Выкапай дол на тым месцы,
Дзе быў я забіты.
Не засыпай ты вачэй

Мне зямлёй хутарскою,
У той, чужой мне, зямлі
Мець не буду я сну.
Роднай зямлёй,
Што змяшана з крывёю маёю,
Разам з байцамі
Засып свайго брата труну.
Не забывай пра Сцяпана...
Хоць сцежкай лясною
Вораг крывавы свой след
Павалок за кардон,
Але ён можа вярнуцца...
Як вернецца ён,
Кроў маю... кроў маю
Змый яго чорнай крывёю...

З песняй ішлі камсамольцы
дарогай сваёю.

Міма бальніцы якраз
Пралягала дарога.
Каля ўваходу
Каманда агульная: — Стой!
Тут іх таварыш.

Дыханнем пажару ляснога,
Сонцам напоўніўся

Цёмны Максімаў пакой.
— Як твае вочы?..
— Агонь не пашкодзіў іх... Бачу.
— Выпішуць хутка з бальніцы?
— Праз тыдзень, другі.
— Ты не бядуй, не сумуй тут.
— Ды я і не плачу.
— Правільна робіш.
— Не след бедаваць, дарагі.
— Мы, калі што, — падтрымаем цябе.
— Падтрымаем!..
Дружнай сябры
Акружылі яго грамадой.
— Ну, будзь здароў...
— Дваццаць восьмага мы ад'язджаем.
—Ты нас чакай,
Мы заедзем сюды за табой,

З ім засталася ў пакоі
Марына адна.
— Вынес каго я... тады? —
Запытаў ён дзяўчыну.
— Вынес Сямёнава ты...—
Адказала яна.
— Хто ён такі?
— Дыверсант,
Памаўчалі з хвіліну.
— Добрую справу, што вынес,

Зрабіў ты, Максім,
Важныя вельмі паперы
Знайшлі мы пры ім.

І па дазволу,
Якога дзяўчыне другой
Ён-бы не даў,
Па адным ім вядомаму праву,
Твар, што ў бінтах,
Да пляча прытуліла рукой,
Па валасах абгарэўшых
Правёўшы ласкава.
— Да пабачэння, Максім! —
І... найшла за парог.
— Да пабачэння!..—
Ён крыкнуць хацеў. Ды не мог.
Крокі за сценкай,
      каманда яе: — Станавіся!
І, як у войску,
      загад камандзіра — закон,
Крокі юнацкія
      ў рытме паходным зліліся.
Сэрца Максіма
      ляцела сябрам наўздагон.
Гэта здарылася ўсё
      на граніцы заходняй.
Скончыўшы бітву
      з нядаўнім пажарам лясным,

Горда ішлі комсамольцы
калонай паходнай,
Крочылі горда,
нібы перад светам усім;
Нібы на іх з-за кардону,
ашчэрыўшы зубы,
Як з друкаваных старонак
штодзённых газет,
Капіталісты глядзелі,
жадаючы згубы,
Сам Чэмберлен
з-за кустоў пазіраў праз ларнет.
Калі не сам,
не банкіры ў цыліндрах прыкметных,
Дык пасланцы іх
хаваліся ў цёмных кустах,
Дык выканаўцы таемных
інтрыг іх сусветных
Ноччу паўзлі з-за кардону
з нажамі ў зубах.
Як не сігары,
дык чорныя іхнія мары
Каля граніцы дымілі
пажарам лясным.
Ведае свет,
аб якім яны марыць пажары,
Хочуць зямлю ўсю
заслаць яны дымам якім.

Хочуць яны, каб дымілі
на людзях шынелі,
Стрэхі на хатах.
Такі ім патрэбен пажар.
Горда ішлі комсамольцы,
як быццам хацелі
Гнеўныя словы падпальшчыкам
кінуць у твар:
— Знайце, падпальшчыкі
войнаў крывавых, калі
Полымя смерці заскача
на вогнішчах чорных,
Гнеў пабяжыць
па сцяжынках сваіх незлічоных
К сэрцу ад сэрца
па нашай вялікай зямлі;
Па чалавечых пакутах,
па гору людскому,
Быццам па пораху тому,
заўсёды сухому,
Гнеў дабяжыць
да вышэйшае кропкі сваёй, —
Выбуху хваля змяце вас
магутнай рукой!

8

Яшчэ не скончылася
афіцыйнае лета,
Яшчэ не злічаны
дні яго календаром,
А ўжо за даллю,
якая смугою адзета,
Восень наладзіла
свой гаспадарчы прыём
Дробным дажджам,
што церусяцца на журавіны,
Нізкім лясным туманам,
што паўзуць з балацін,
Сонцу, што свеціць
не больш як чатыры гадзіны
З дзённых сваіх
чатырнаццаці з нечым гадзін.
Ладзіць прыём павуцінам,
што верас задумны
Кінуць гатовы ўжо,
каб паляцець у прастор,

Гулкім машынам,
        якія завезены ў гумны,
Бесперастанку працуюць
        ад зор і да зор.

Неафіцыйная восень
        чырвоным абозам
Звонкім вяселлям
        па полі пракладвае пуць.
Скрозь семафоры адкрыла
        яна паравозам,
Што караваны вагонаў
        па рэйках вядуць.

Покуль збіраецца
        вырай птушыны за лесам,
Покуль рыхтуецца ён
        у далёкі адлёт,
Першымі восень свае
        караваны з жалеза
Рушыла з месца
        на поўнач, на захад, на ўсход.

Рушыла іх па зямлі яна,
        а не па небу,
І загадала ляцець
        не на поўдзень зусім, —
Цёплых краін
        караванам жалезным не трэба,

Поўдзень і поўнач
патрэбны аднолькава ім.

Сёння адна ў падарожжа
іх рушыла мэта:
Стомы не ведаць,
імчаць у прасторы палёў.
Каб адусюль,
дзе студэнцкае скончана лота,
Па інстытутах развезці
дзяўчат і хлапцоў.
Скончана лета...
Хаця й невядома машынам,
Колам, якія грукочуць
і ноччу і днём,
Што гэта ім не чыгунка,
а што гэта ўсім ім
Восень наладзіла
свой гаспадарчы прыём.

Дзень дваццаць восьмага жніўня
Не меў выключэнняў.
Нейкіх прыкмет асаблівых
Дзень гэты не меў, —
З-за туманоў не відаць было
Сонца праменняў,
Лісце вільготнае,
Золкае падала з дрэў.

У гэты дзень
Уставала Паліна на золку.
Не пазнавала мясцовасці
Новай з акна:
Дом яе, клець
У калгасным стаялі пасёлку.
Хутар рашыла з Цімохам
Пакінуць яна.
Дом перавезлі
За некалькі дзён талакою.
Цёмнага, страшнага лесу
Цяпер не відно.
Хіба было ў гэтым доме
Жыццё хутарское?..
Калі было, дык, здавалася,
Вельмі даўно.
Чорная бура
Разнесла яго нечакана.
Громам смяротным сваім
Прагрымела над ім,
Там, у тым лесе,
Былое жыццё пахавана.
Жыць трэба новым жыццём.
Непадобным. Другім.

Дзень дваццаць восьмага жніўня.
Гасця выпраўляла
З дому. Фурманку прыслаў

Па Цімоха калгас.
Рэчы ў дарогу
Яна яму моўчкі сабрала.

— Еду. Бывай!..
Развітання кароткага час.
— Едзеш? Дарогі шчаслівай
Табе я жадаю...
— Дзякую, Поля.
— Не злуйся.
— Ды што ты, ды не...
— Не гавары так, не трэба,
Бо знаю сама я,
Што вінавата:
Загінуў Змітрок праз мяне.
Брат твой
Са мной не жаніўся-б, —
Жыцця хутарскога,
Пэўна, не ведаў-бы.
Пэўна, не знаў-бы астрога,
Ганьбы... Як я
Клапацілася мала аб тым!..
Нават нядаўна,
У часе пажару ляснога,
Горка прызнацца,
Я думала мала аб ім.
Можа не варта было
Гаварыць гэта ўсё мне...

Не адказаў ён. Правёўшы
Яго за парог,
Пацалавала... Ды так,
Што ў вачах стала цёмна,
Так, каб за год пацалунак
Забыць ён не мог.
Ног пад сабой не пачуў ён,
Сыходзячы з ганку,
Так павяло яго
Моцнае гэта віно!..
Так павяло, што но мог,
Калі сеў на фурманку,
Но азірнуцца...
Паліна глядзела ў акно.

Дзень дваццаць восьмага жніўня...
Максіма з сабою,
Хоць не без цяжкасцей,
Але забралі сябры
Ад дактароў яго,
Ад медыцынскай сястры —
Будзе Марына ў дарозе
Яму медсястрою.
Самі ўзяліся давезці
Да месца вучобы,
Там-жа, на месцы,
Яго паказаць дактарам,
Ну, а спытаюць гісторыю,

Скажам, хваробы —
Хіба яна невядома
Ягоным сябрам?
Селі на поезд, паехалі
Разам з Максімам,
Зноў пакідаючы свой
Пагранічны раён.
Спалены лес засцілаючы
Парай і дымам,
Поезд імчаўся. Спыніўся.
Усе — да акон...
Тут, як пасля буралому,
Пасля навальніцы,
Зноў пачынала ўваходзіць
Жыццё ў берагі:
Сцягвалі дрэвы,
Заворвалі попел плугі...
— Хлопцы, дзяўчаты, зірніце!
— Бударын, зірніце!..

Разам з вялікаю,
З дружнай людской грамадою
Ён працаваў тут
І працы вясёлай быў рад.
Крыкі пачуў ён.

Пазнаўшы хлапцоў і дзяўчат,
Ён усміхнуўся,
Махнуў у адказ ім рукою.

А паравоз, быццам гэтага
Толькі чакаў,
Свіснуў раскаціста... З месца
Скрануўся састаў.

Было падобна:
Бударын не проста рукою
Ім памахаў, а што ён ім
Адкрыў семафор,
Быццам-бы выправіў,
Было падобна на тое,
Іх у дарогу жыцця...
У вялікі прастор!

Ехалі разам сябры...
Далята лі з вагона
Песні дзяўчат
і чуваць быў гармонік Сымона.
Ехаў Цімох,
хоць і ў поездзе тым-жа, з сябрамі,
Але спяваць не спяваў...
Разумееце самі,
Колькі апошнімі днямі
зазнаў ён трывог,
Колькі яму перажыць давялося.

Цімох
Верхнюю полку заняў
і ляжаў нерухома.

Думаў аб тым ён, як будзе вучыцца,
як жыць
Будзе цяпер... А яшчэ?
Аб Марыне, вядома,
Што не забыў ён яе
і не можа забыць.
Не разлучаўся ён
і не разлучыцца з ёю!..
Ён давядзе ёй
вучобаю, працай сваёю,
Што ён не зломак які,
што ён нечага варты...

Поезд ляцеў' і ляцеў,
рваўся ўдалеч, упарты.

Ну, а Марына?..
Цімоха было ёй шкада.
Вестка суровая
ўразіла ўсіх нечакана,
Сэрцы пракляццем
закрэслілі імя Сцяпана.

Горка было,
як пасцігла Цімоха бяда,
Думаць Марыне,
што з ім размаўляла сурова,
Што не сказала ні разу
ласкавага слова.

Шчыра яна бедавала,
што страціў ён брата.
Рада была, што вучыцца
ён едзе ізноў,
Хутар забыў... Можа ў тым
і яна вінавата?

...Поезд ляцеў і ляцеў
па прасторах палёў.

Ехалі...
Спалены лес прамінулі даўно.
З а вечарэла...
Лясы абышоўшы, даліны,
Кінула ранняя восень
паштоўку ў акно,
Поездам хуткім сарваную
з вецця каліны,
З лесу пасланую...
Так, як упала, яна
Ціха ляжала на століку
блізка акна,
Моўчкі па ёй
і Максім і Марына чыталі
Лета аповесць,
якое яны пакідалі.
Потым яны задрамалі.

Няхай-жа прысніцца
Ім падарожжа, граніца,
пад вартай — крыніца,
Яр, дзе яна працякала
і бесперапынна
Мыла каменьчыкі
і калыхала траву!..

Ніжай і ніжай
хіліла сваю галаву,
Зачараваную музыкай колаў,
Марына,
Закалыханую сном,
на плячо дружбаку.
Полымя хусткі
яму абпаліла шчаку.
Ён прахапіўся.
Куды тая дзелася стома?

Колы грымелі...
Сядзеў ля акна нерухома
Ён да світання,
дзявочы вартуючы сон.
Вось за акном пасвятлела.
Шкада, што вагон
Спыніцца хутка,
павыйдуць усе на перон.
Там, на пероне,
разлучыць з Марынай Максіма

Поезд. На колькі?
Хто знае? На год, а магчыма
І назаўсёды... Хто знае?
А як-бы Максім
Ехаць жадаў праз жыццё з ёй
вось так, як сягоння,
Ехаць далей і далей,
у агульным вагоне,
Аб развітанні
не думаючы зусім.

Поезд спыніўся.
Павысыпалі з вагона
Хлопцы, дзяўчаты,
нібы птушаняты з гнязда,
Зніклі з вачэй
у шумлівым натоўпе перона
З клункамі ды сундучкамі сваімі...
Шкада!
Іх паязды падхапілі
і недзе за светам
Зніклі з сябрамі маімі.

Адзін я стаю,
Поезд апошні правёўшы...
Дазвольце на гэтым
Кропку паставіць.
Аповесць закончыць маю.

З ёю згадаў я сягоння
юнацтва пару.
Подых граніцы суровы,
сяброўства, каханне.
Светлыя вобразы!
Некалі зноў вас збяру,
Я не кажу вам: — Бывайце!..
Кажу:— Да спаткання!
Я тут збіраў вас,
маіх незабыўных сяброў,
Не для забавы вам
песню складаючы гэту,
А каб праз вас перадаць яе,
як эстафету,
Нашым гадам
ад далёкіх трыццатых гадоў.
Не калыханкай бацькоў
над спакоем дзяцей
Хай гэта песня гучыць, —
а як праўда жывая
Аб той граніцы трывожнай,
што свет раздзяляе,
Ад еўрапейскіх краін
да абшараў Кітая,
З гулам праходзіць па сэрцах
мільёнаў людзей.
З вамі я рос, з вамі жыў,
як у доме адным —

Блізка граніцы той самай
са светам старым,
Што ні на хвілю
ў спакоі нас не пакідала,
Той, што для нас
бліндажамі, траншэямі стала,
Калі ўварвалася
з Захаду ў край наш навала,
Той, што з баямі
прасоўвалася па зямлі
Ноччу і днём,
па якой, замест рэк, працяклі
Слёзы і кроў...

Мы салдацкую клятву далі
Знішчыць граніцу крывавую,
сцерці дазвання.
Многа наперадзе спраў
пакаленню майму.
Мы яшчэ стрэнемся
з вамі, сябры!.. А таму
Я не кажу вам: — Бывайце!
Кажу: — Да спаткання!

На белорусском языке

Аркадий Кулешов

ГРАНИЦА

Государственное издательство БССР
Минск 1954

*

Рэдактар *А. Кучар*
Мастак *Д. Прагін*
Тэхрэдактар *Ю. Аляксеева*
Карэктары *Р. Маўшовіч і Л. Тавачэнка*

*

АТ 03469. Падп. да набору 14/1-1954 г.
Падп. да друку 13/Iv-1954 г. Тыраж 8 000 экз.
Папера 70X108/$_{32}$. Пап. арк. 1,68. Друк. арк. 4,62.
Аўт. арк. 3,6. Уч.-выд. арк. 3,7. У друк. арк. 32040 зн.
Цана 3 руб. 35 кап. Зак. 76.

Друкарня Імя Сталіна, Мінск,
праспект імя Сталіна, 105.